УДК 373.5.671:811.161.3

# ХАРАКТАРЫСТЫКА СУЧАСНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ ДА АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА ІІ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Доўгаль Д. А. (Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”,
кафедра беларускай і рускай моў)

Анатацыя. У артыкуле раскрываецца змест і структура дапаможнікаў, прызначаных для падрыхтоўкі школьнікаў да алімпіяды па беларускай мове на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Падаецца характарыстыка аўтарскага дапаможніка па падрыхтоўцы да алімпіяды ў святле кампетэнтнаснага падыходу.

Алімпіяды па вучэбных прадметах – распаўсюджаная форма работы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі, якая патрабуе належнага вучэбна-метадычнага забеспячэння. Нам ужо даводзілася характарызаваць асобныя дапаможнікі, якія маюць на мэце арганізацыю працы з інтэлектуальна адоранымі малодшымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

школьнікамі [1]. Мэта дадзенага артыкула – раскрыць структуру, змест, метадычныя асаблівасці вучэбных выданняў, якія прызначаны для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Першы з дапаможнікаў – адзіны на сённяшні момант рэкамендаваны НМУ "Нацыянальны інстытут адукацыі" – з'яўляецца плёнам працы настаўніка ДУА "Пліская ДС–СШ Глыбоцкага раёна" А.С. Зубко [4]. Выданне складаецца з асобных заняткаў, якія ўключаюць разнастайныя моўныя (арфаграфічныя, лексічныя, сінтаксічныя і інш.), маўленчыя і літаратурныя заданні, матэрыялам для якіх служаць словы, сказы, народныя выслоўі (загадкі, скорагаворкі, прыказкі), вершаваныя і празаічныя фрагменты мастацкіх твораў, тэксты. На жаль, у дапаможніку адсутнічае паўнавартасны метадычны каментарый, з якога было б зразумела, якіх прынцыпаў прытрымліваецца аўтар, аб'ядноўваючы пэўны матэрыял у межах адной распрацоўкі. Цікавай падаецца спроба вызначаць тэму заняткаў, абапіраючыся на асноўную лінгвакультуралагічную інфармацыю (напрыклад, заняткі 4 маюць назву "Хлеб – багацце нашага народа"), але такія спробы ў дапаможніку адзінкавыя. Адсутнічае ў выданні і ўказанне на формы работы, прыдатныя для найлепшага выкарыстання прапанаванага матэрыялу.

Дапаможнік "Рыхтуемся да алімпіяды па беларускай мове (заданні для вучняў 5–9 класаў)", складзены Я.І. Кілбас [5], прызначаны для сістэматызацыі ведаў у рамках школьнага курсу беларускай мовы і мае на мэце дапамагчы вучням у падрыхтоўцы да інтэлектуальных спаборніцтваў. Выданне ўключае сем раздзелаў (раздзелы 1–6 вылучаны на моваазнаўчай аснове і аб'ядноўваюць заданні па пэўным узроўні мовазнаўства; раздзел 7 "Для цікаўных і дапытлівых" змяшчае займальныя заданні комплекснага характару), алімпіядныя заданні, размеркаваныя па класах, і даведачную частку. Нягледзячы на тое, што для вучняў 9 класаў праводзіцца рэспубліканская алімпіяда, у якой прадугледжана не толькі комплексная работа, але і водгук з выказваннем, у дапаможніку адсутнічае матэрыял, скіраваны на падрыхтоўку да гэтых конкурсаў, што абмяжоўвае магчымасці выкарыстання выдання ў адукацыйнай практыцы. Увогуле, аб'яднанне ў адным дапаможніку матэрыялаў для падрыхтоўкі да алімпіяд з розным конкурсным складам, на нашу думку, не з'яўляецца мэтазгодным.

Падрыхтоўка да алімпіяды па беларускай мове прадугледжвае фарміраванне як прадметных (моўнай, маўленчай, лінгвакультуралагічнай), так і метапрадметных (вучэбна-пазнавальнай, інфармацыйнай) кампетэнцый вучняў. На вырашэнне гэтай задачы скіраваны распрацаваны намі дапаможнік "Тэставыя комплексы для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове. 6–7 класы", які рыхтуецца да выдання ў выдавецтве "Народная асвета". Асобныя тэсты з будучага дапаможніка апублікаваны на старонках часопіса "Роднае слова" [2; 3].

Змест дапаможніка адпавядае вучэбнай праграме і ўключае 12 тэстаў (па шэсць для кожнага класа), якія змяшчаюць тэарэтычныя пытанні і практычныя заданні. Адзін з тэстаў прысвечаны тэме "Склад слова", іншыя – часцінам мовы, якія вывучаюцца на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Актуалізацыі і сістэматызацыі набытых ведаў, уменняў і навыкаў садзейнічаюць тэсты, прысвечаныя паўтарэнню вывучанага ў 5-ым класе (уводны тэст) і падагульненню і сістэматызацыі пройдзенага ў 6–7-ых класах матэрыялу (заключны тэст).

Кожны тэст складаецца з трох частак (А, Б і В), якія ўключаюць розныя па форме і функцыі заданні. У частцы А прапануецца 10 тэставых заданняў закрытага тыпу, якія прадугледжваюць альтэрнатыўны выбар адказу ("так" або "не"). Частка Б змяшчае 10 тэставых пытанняў закрытага тыпу, сярод якіх вылучаюцца пытанні з множным выбарам адказаў (з чатырох прапанаваных варыянтаў патрэбна выбраць адзін правільны) і заданні на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух спісаў (напрыклад, фразеалагізмаў і іх значэнняў). Тэставы матэрыял гэтых частак можа выкарыстоўвацца з мэтай дыягностыкі цяжкасцей у авалоданні лінгвістычным матэрыялам, служыць сродкам кантролю сфарміраванасці моўнай і маўленчай кампетэнцый вучняў. Стандартызаваная форма падачы заданняў, зручнасць апрацоўкі вынікаў (кожны правільны адказ часткі А ацэньваецца двума баламі, часткі Б – трыма) забяспечваюць магчымасць аб'ектыўнай ацэнкі якасці ведаў.

У частцы В падаецца 10 тэставых заданняў адкрытага тыпу, складзеных на матэрыяле тэкстаў, уключаных у спіс твораў для дадатковага чытання па беларускай літаратуры (казка "Купальскія светлякі" Якуба Коласа, апавяданне "Кніганошы" У. Караткевіча, кніга нарысаў "Зялёны лісток на планеце Зямля" Я. Сіпакова і інш.). Тэкст як дыдактычны матэрыял дазваляе арганізаваць працу па засваенні арфаграфічных, лексічных, граматычных і іншых нормаў літаратурнай мовы і адначасова спрые развіццю агульнага і літаратурнага кругагляду вучняў, служыць асновай фарміравання чытацкай пісьменнасці. Выкананне асобных заданняў прадугледжвае самастойную працу вучняў з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі (вучэбнымі дапаможнікамі па мове і літаратуры, даведнікамі, слоўнікамі розных тыпаў), што дазваляе разглядаць тэставыя заданні часткі В не толькі як сродак дыягностыкі ўзроўню сфарміраванасці прадметных ведаў і навыкаў, але і ў якасці матэрыялу для развіцця інфармацыйных уменняў вучняў.

Кожны правільны адказ часткі В прапануецца ацэньваць пяццю баламі, пры гэтым дапускаецца наяўнасць часткова правільных адказаў. Максімальная сума за выкананне ўсіх заданняў тэсту, такім чы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нам, складае 100 балаў. Гэты падыход робіць ацэньванне тэстаў зразумелым для вучняў. Да ўсіх тэставых комплексаў падаюцца даведкі, што дазваляе выкарыстоўваць дапаможнік для арганізацыі самастойнай працы вучняў пры падрыхтоўцы да інтэлектуальных конкурсаў.

Узнікненне дапаможнікаў, прызначаных для падрыхтоўкі вучняў да алімпіяды па беларускай мове на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, абумоўлена неабходнасцю навукова-метадычнага забеспячэння педагагічнай падтрымкі адораных навучэнцаў. На дадзеным этапе можна канстатаваць пошук аптымальных зместава-структурных характарыстык дадзеных выданняў з улікам праграмных патрабаванняў і спецыфікі інтэлектуальных конкурсаў па беларускай мове.

## Літаратура


1. Доўгаль, Д. А. Дапаможнікі для падрыхтоўкі малодшых школьнікаў да алімпіяды па беларускай мове : крытычны агляд / Д. А. Доўгаль // Актуальные проблемы методики начального обучения и эстетического воспитания учащихся : материалы IV Республиканской научно-практической конференции, 30 марта 2017 г., г. Могилев, МГУ имени А. А. Кулешова / под ред. С. П. Чумаковой, А. А. Папейко. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2017. – С. 124–127.
2. Доўгаль, Д.А. Тэставыя комплексы па беларускай мове : Назоўнік (VI клас). Дзеепрыметнік (VII клас) / Д.А. Доўгаль // Роднае слова. – 2018. – № 1. – С. 63–65.
3. Доўгаль, Д.А. Тэставыя комплексы па беларускай мове : Склад слова (VI клас). Дзеяслоў (VII клас) / Д.А. Доўгаль // Роднае слова. – 2017. – № 9. – С. 59–62.
4. Зубко, А. С. Беларуская мова і літаратура. Алімпіяды 5–6 класы / А. С. Зубко. – Мінск : Аверсэв, 2016. – 287 с.
5. Рыхтуемся да алімпіяды па беларускай мове (заданні для вучняў 5–9 класаў) : дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / склад. Я. І. Кілбас. – Мазыр : Белы Вецер, 2016. – 148 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова